Poczta opłacona ryczałtem. Цана 25 гр.

№ 2. Панядзелак 25 Сакавіка 1929 г. Год 6.

Авадзень

Дватыднёвік сатыры, жартаў і сьмеху.



Žonka čytača: -Moj Staś prywyk da hetaj (chawaj Boža!) hazety, jak chto k harełcy... Pajedziem damoŭ.

Susied: -Čytaj, swatok, da astatniaje literyny.



-Ci ja tabie, Panas, nie kazała, što ni adnych nas nieuradžaj zmaryŭ...

-Praŭda...Widać usim nia łohka žyć na świecie...

XXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXX

Р а з г а д а ў .

Вучыцель:

-Адзін фурман праежджае ў гадзіну 10 вёрст, а другі-толькі 7. На каторай вярсьце дагоніць першы другога, калі другі выедзе на 15 мін. раней першага?

Вучань:

-Гэта, пане прафэсар, залежыць ад таго, на каторай вярсьце стаіць першая на гэтай дарозе карчма.

Фальшывым „беларусам."

Прыкрыўшыся вопраткай белаю,
Свой воблік схаваўшы пад ей
Крупіцца пачалі вы сьмела
Паміж Беларусі дзяцей.
І цешучысь песьняй іх нуднай,
Што рвецца з зсалелых грудзей
Вы с шчырасьці мінай аблуднай
Да працы ўзяліся сваей.
І ціха, на хлебныя нівы
Чужых вам ад веку людзей,
Вы сеяць пачалі крапіву
Рукою нядобрай сваей...
....
Ня цешцеся гэдак зараньня
За летам заўш восень брыдзе...
Паволі й да вас час зьбіраньня
Таго што вы сеялі йдзе.

Янсон.

Racept .

Doktar napisaŭ i padaje chworaj racept.

-Kolki treba płacić wam, panie doktar?

-50 złotych.

Chworaja zrywajecca z kresła i ad nerwowaści biehaje pa pakoju.

-Addajcie mnie racept,-kaža daktar.

-Ci pan d-r choča canu zmienšyć?

-Nie, chaču štoś dapisać na uspakajennie raspaninych nerwaŭ.

Cyr.War.

O biblijatecy.

-Dajcie mnie dobruju knižku pra luboŭ,-prosić maładzieńkaja abanentka.

-Ja nie chaču was psawać,-adkazwaje biblijatekar.

-Čamu -pytajecca taja.

Dyk-Dz.

Янка новабранец атрымаў карабін на рукі.Пасьля муштры ён пытаецца у таварыша:

-Браток! ты болей ужо ведаеш на што гэта дзірка у стрэльбе?

Таварыш засьміяўся ды кажа:

-Ці-ж ты сам не дадумаўся?гэта каб стрэльба была лягчэйшаю.

ооооооооо

Пры сьмерці.

Паміраў стары Залман.Каб развітацца з раднёй ён пачаў зваць:

-Ці мая жонка Сора тут?
-Тут.
-Ці дачка Гіндэлэ тут?
-Тут.
-Ці Хайкелэ тут?
-Тут татэ.
-Ці сын Мойшэ тут?
-Тут.
-І Бэрка тут?
-Так,татэ.
-Хто-ж пры гандлю,каб вас...

Фармановіч

Па тэлефону.

-Галё Ці там ломбард?

-Ломбард.А што трэба?

-Калі ласка...Якая цяпер гадзіна?

-Пану здаецца што я сяджу на тое,каб гадзіны гаварыць?мыліцеся.

-Ніскольки:У вашым ломбардзе мой гадзіньнік.

Cyr.Warsz.

-Piatrok,čamu ty wychodziš z chaty,jak twaja žonka piaje?

-Bo nie chaču,kab susedzi padumali što ja jaje bju.

Перад злачынствам.

Адзін злодзей кажа другому:

-Сьмялей,браток,лезь! Ведаеш-жа што адвага і твайму бацьку была частаю таварышкай у жыцьці.

-То то і я думаю:пакуль ён лазіў праз дзьверы было усё добра, а як набраўся адвагі ды палез праз вакно,дык яго й забілі.

Якая радня...

Сярэдні брат пытаецца у старшага:

-Скажы,браток,што гэта за радня прыходзіцца нам наш бацька?

-Ня ведаю добра,але с таго часу,як я стаў помніць,маці усягды яго называла бацькам і мне прыказывала,але хто ён нам прыходзіцца-ня ведаю.

У гаворку умешаўся меншы:

-Што там гаварыць глупства,"ня ведаю".Ды ён загэта прыходзіцца нам радня,што з нашай маткай ажаніўся.

К.Зерня.

ДАГАДЛІВАЯ.

Нехта наймае пакой пры сям'е ды хваліцца:

-Панічка.Як выежджаў я с папярэдняе кватэры дык гаспадыня... наўзрыд плакала...

-Ну...у нас гэтага ня будае,- адказала востра новая гаспадыня, -бо грошы за пакой прыдзецца васпану заплаціць наперад. CyrWar

Як хто...



Адна газэта, каб прыдбаць сабе
больш чытачоў, мяркуе гэдак:
Трэба палітыкай заняцца
Ды больш сваіх людзей бадзяць.
Кусаць, у вочы ім кідацца...
Мо' болей хто-б пачаў чытаць.
Бо во як пішым вершы-жарты
Або які-нібудзь расказ,
Дык людзі кажуць, што ні варта
Саўсім і ў рукі браці нас.
Каб хоць вайна або здарэньне
Якое грымнула як гром,-
Мяне-б чыталі ўсе штодзенна,
Мой курс у гору б бег бягом.



Фэльшар без працы бядуе:
Працы німа; галекць людзі;
Абеззабоціўся народ...
Што з лекарамі гэта будзе,
Як так пацягне колькі год?
Хіба чахотка што падсобіць,
Але дарма, ну як лячыць!
Каб газы мо' якія зробіць...
Хваробы на людзей пусьціць...



Адзін бедны абаронца стогне:
Чорт ведае што гэта стала!
Так цяжка зробілася жыць
Саўсім цяперка працы мала-
Трэба задумаць што рабіць.
Народ пакінуў біцца, красьці,
Ці на каго дзе нападаць...
Ці то другое тут нешчасьце-
(Мо' мне не сталі даверaць?)
Здаецца вінным пасабляеш
За грошы кару адпіхнуць,
Або нявінных заматаеш
Гадоў на колькі адпачнуць.
Каб голад больш людзей прыцісну,
Ні праўда-ён-ба ўсё зрабіў:
Той дзе напаў, а той што сьвіснуў
Ну я-б тады ізноў зажыў.

Awadnia praĉytaj sam, a tady daj jaho paĉytać susiedu. Chaj ŝyryc-ca pamiž Was rodnaje słowa.

Адзін баязьлівы чыноўнік кажа:
Здаецца нас цяпер нямнога,
А з верху ўсё яшчэ глядзяць
Каб без ніякага нічога
Яшчэ й яшчэ рэдукаваць!
Што мне рабіць? што гэта будзе?
Ці-ж зрэдукуюць нас усіх?
Не! трэба выдумаць, каб людзі
у „kolejkach" стоючы даўгіх
Па тры-пяць месяцаў чакалі

На „залатвеньне" справаў іх
Тады-б мо' не рэдукавалі:
Бо хто-б „залатвіў" іх усіх!
А ты сядзі сабе капайся,
Ды атпраўляць іх не сьпяшы;
Там пафліртуй, папрыглядайся,
Аж во глядзіш... і тры часы.

Злодзей быдуе уздыхаючы:
Ах каб вайна хутчэй паўстала.
(Няго народ паразумнеў!)
Тады б жыцьцё для нас настала:
Грабіў-ба кожны што хацеў.
Каму вайна-гэта нешчасьце,
А нам вайна-дык гэта рай..
На фронце, калі добры майстар,
Бій, граб, здзірай ды прадавай.
Адказнасьці тады ніякай
(Абы канцы умеў схаваць)...
Ах, каб людзей прыціснуў голі
Голад-дык сталі-б ваяваць.

......

Усякі хоча будаваці
Шчасьце сваё ў чужых сьлезах...
Хацеў-ба шчыра ўсім гукаці
Зьмяніце план у галавах.

Янсон.

OOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOOO

O bibliatecy..

_ Dajcie mnie dobruju knižku,
ja na was pakładajusia.
-Kali wy ŭsie na mianie pakładziecieśia, dyk ja nia wytrymaju.
-Nie, nie: na waš smak...
-I smak moj nie datrymaje.

Dyk-Dzieła.

-Dzie ty žywieš?
-A tam proci teatru.
-Proci jakoha teatru?
-A proci taho, što kala majej kwatery.

Здарэньне ў лазьні.

От, братцы мае, якая са мной чартовіна вышла. Проста умерці са сьмеху.

Сяджу гэта я, значыцца, і як-быццам сьмешны расказ складаю аб утопленьніку.

А жонка гавора:

-Што гэта, -кажа, -ёлкі-палкі, у цябе твар індыфэрантны. Пашоў бы, кажа, -у лазьню памыўся-б.

А я адказваю:

-Што-ж кажу пайду. Памыюся. І пашоў.

-І што-ж вы, братцы мае, думаеце? Не пасьпеў гэта я мачалкай, выбачайце за словы, плечы намыліць чуць-каравул крычаць.

Пэўна думаю, нехта мылам удавіўся ці варам абварыўся.

А з прадлазьніка між іншым чалавек выскаквае. Голы. Каравул крычыць.

Мы ведама да яго. У чым справа? - пытаемся. Што, пытаемся, здарылася?

А чалавек барадою трасе і рукамі размахвае.

-Каравул! крычыць, у мяне нос укралі!

І запраўды. Паглядзелі: у яго замест наса-голае месца.

Ну тут, ведама, рашылі народ абшукаць. А голых абшукаць саўсім плёвае дзела. Калі ўкраў што, дык у рот не схаваеш.

Абшукваюць. Гляджу, да мяне чарга падходзіць. А я, як на грэх, намыліўся увесь.

-А ну, гаворуць, грамадзянін абмыйцеся.

-Абмыцца, кажу, можна. З мылам, кажу, у нагавіцы не палезеш. А толькі, кажу, дарэмна сябе турбуеце. Я кажу, іхняга наса ні браў. У мяне, кажу, свой нос ёсьць.

-А гэта, гаворуць, пабачым.

Ну, абмыўся я. Гляджу... ёлкі-палкі, й запраўды-ж у мяне два насы!

Чалавек, ведама, у амбіцыю.

-Вельмі-ж, крычыць, з вашага боку нахальна у працоўных насы красьці. За што крычыць змагаліся

А я кажу

-Надта, кажу, мне ваш нос патрэбны. Можаце, кажу, ім давіцца. Не ў насе, кажу, шчасьце.

Шывргануў гэта я яму значыцца нос і дамоў пашоў. А ў дарозе ўстрывожыўся:

А ну-ж, думаю, я насы перапутаў! заместа чужога свой аддаў?!

Хацеў было назад вяртацца ды плюнуў:

--Хвароба, думаю, з ім. Няхай карыстаецца. Мо' ў яго яшчэ што ўкрадуць а мне аддувайся.

Пародыя А Ар-скага на
М.Зощенко
Пераклаў з расейс. С-ъ

inv. 25.

НАВУКА.

Раз на возеры улетку,
Дзе гэны трасьнік,
Там на рыбку сваю сетку
Распусьціў старык.
І да берага кіруе
Ўжо сваё чаўно,
Бо у сетцы рыбка, чуе,
Ёсьць ужо даўно.
„То то будзе паядухі,"
Думаў стары дзед, -
Не зьямо мы са старухай
За адзін абед.
Ну пабольшую прадаці
Ў рынак панясу,
А там, трэба крыху даці
Сыну Францусю."
І во гэдак змеркаваўшы
Вылез дзед на брэг,
Ды на рыбку хутка ўзяўся
Рыхтаваці мех.
- Але ці ня лепей, - кажа, -
Так абмазгаваць,
Каб яе во тут адразу
Ды й пасартаваць;
Чым пасьля ізноў у хаці
З ёю клопат мець. -
Толькі як тут рады даці?
Дзе яе падзець?
Мех адзін, а рыбы многа
Ў сетцы, у вадзе...
Не ня здумаю нічога
Я у сваей бядзе.
Ды падумаўшы з гадзіну
Дзед аж стаў пяяць...
„Што я! што я! трэба сына
Клікнуць пасабляць.
- Ён якраз на панадворку
Дровы чую бье..."
І узабраўшыся на горку
Сына дзед заве.

„Гэй Францусь хадзі ды хутка!
Хутка, як мага!
Столькі рыбы у сетцы тутка,
Што й сказаць нелага.
Ды мяшкі нясі... а Мілцы
Не забудзь сказаць:
Хай пад'едзе на кабылцы
Рыбу тут забраць!"
Гэта ўчуўшы і суседзі
Дзіва йшлі глядзець,
А старык на сетку гледзя
Сына ўсё завець.
- Ну а дзе-ж тут тая рыба? -
Сын прыйдзя спытаў.
- Хай цябе! ні бачыш жіба!..
Дзед так загукаў.
Паглядзі вун як у сетцы
Пачала гуляць...
Цягнем, бо як узлуецца -
Можа сець парваць.
Во натужылі вяроўку
Пачалі цягнуць,
А суседзі на прыгорку
Сабраўшыся ждуць.
Дзед аж стогне: цяжка, - кажа,
Сетка йдзе нябось...
Вось як выцягнем - дык зважым.
Колькі рыбы ёсьць."
Вось да берага ўжо блізка;
Выцягнулі - бразь...
Колькі сьмеху, колькі піску
Паднялося ўраз!
Злосна дзед скрабаў за вухам,
Бо здабычы ўсей:
Сьлімакі, карчы, рапухі...
Рыбкі-ж ні аднай.

....

- Ах, сусед, учыся ўнова, -
Кажа сват Пракоп,
Не пераскакнуўшы рову
Не кажы брат „гоп!"

Ян-вас.

Ціваслалі Вы ужо падпіску на Авадня?

PRAŬDZIWAJE ZDARENNIE.

Betaj zimoj padčas wialikich samych marazoŭ pryšłosia kumam wiažei kścić rabionka.

Zajechali u miastečka, paŝli u kaściol, akścili rabionka. Paśla zajŝlisia da arhanistaha pahrecca pierad darohaj, dy tam pačarcy wypili.

Da domu było wiorst dziesiać. Kab nie ciahnuć da poznaha (bajalisia waŭkoŭ) kumy nie marudzili i praz paŭhadziny užo jechali damoŭ.

Rabionak byŭ dobra abkručany pialenkami, abwierčany kołdrami i ležaŭ u padušcy na kalenkach u kumy. Taja ściskajučysia ad marozu zanadta musić starenna abkrywała siabie i paciskała padušku... Dosyć taho, što padčas jazdy rabionak s paduški wyśliznuŭsia i zwaliŭsia na śnieh.

Kuma hetaha nie zaŭwažyła i damoŭ prywiezła tolki padušku.

Baćki i hości chapilisia:

-A dzie-ž dziacionak?

Kinulisia na kaniooh nazad...

U trach wiarstoch ad domu na śniahu, pry samaj darozie, znajŝli jaho. Spaŭ. Byŭ dobra abkručany... maroz ni zaŝkodziŭ...

Radaść kumoŭ i baćkoŭ była nie da apisannia.

Anwas.

xxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxx

Pradajucca a p o ŝ n i j a k a m p l e k t y daŭniejŝaha A w a d n i a.

Cana s pierasyłkaj 3 zł. a dla padpiščykaŭ tolki 2.25. Hrošy adresawać u Redakcyju Awadnia, Wilno, Wielka 3-10.

Чыноўнік рупіцца на службу. Па дарозе ён опатыкае гандляра і пытаецца:

Перапрашаю вас: каторая цяпер гадзіна?

Я зьбіўся са шчоту..

-Tut panu budzie tak sama dobra jak i doma.

-Oho... Tady ŭciekaju... Spadziewaŭsia, što tut, prynamsia, znajdu spakoj.

Cyr. War.

НАША ПОЧТА: Усіх падпішчыкаў і прыяцеляў А в а д н я віншуем з сьвятам Пасхі і вясной.

Adras Radakcyi: Wilno, Wielka 3-10. Padpiska na hod 6 zł; na paŭhoda 3 zł; na try miesiacy 1 zł 50 hr; Za hranicu na hod dwa dalary.

Radaktar-Wydawiec Anton Wasileŭski.

Litogr. Łaskowa Wilno, ul. Subocz Nr 9.